УДК 947.6.«1917»

**І. М. Рыжанкоў**

Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт

# АГРАРНЫ РУХ У БЕЛАРУСІ Ў ПЕРСПЕКТЫВЕ ВЫРАШЭННЯ ЗЯМЕЛЬНАГА ПЫТАННЯ (САКАВІК – МАЙ 1917 Г.)

У артыкуле асвятляецца аграрны рух у беларускіх губернях на этапе разгортвання рэвалюцыйных падзей, якія ахапілі Расію вясной 1917 г. Аўтар адзначае, што ў сакавіку – красавіку сіламі новаабраных дзяржаўных і грамадска-палітычных структур сяляне Беларусі паступова знаёміліся з пераменамі. На маніфістацыях, мітынгах, у час малебнаў, шэсцяў былі агучаны задачы рэвалюцыі – шырокая дэмакратызацыя, вядзенне вайны да пераможнага канца і канчатковае вырашэнне аграрнага пытання дэпутатамі Устаноўчага сходу. На сходах сяляне пагадзіліся чакаць правядзення зямельнай рэформы і максімальна аказваць дапамогу арміі. З другой паловы красавіка сялянскія сходы з новаабранымі валаснымі камітэтамі пачалі выносіць пастановы аб перадачы дзяржаўнай і прыватнаўласніцкай зямлі, лугоў, выпасаў сялянам, пашыралася высечка лесу. Да спынення незаконных рашэнняў прыцягваліся актывісты камісарыятаў, харчовых і зямельных камітэтаў, судовыя структуры і «рэвалюцыйная дэмакратыя» – Саветы сялянскіх дэпутатаў, грамадскія і партыйныя сілы. Вясной 1917 г. аграрны рух у беларускіх губернях не набыў масавага характару, сяляне не выказвалі адкрыта свайго незадавальнення дзяржаўнай уладай.

**Ключавыя словы:** рэвалюцыя, захоп зямлі, аграрнае пытанне, «рэвалюцыйная дэмакратыя».

**I. M. Ryzhankou**

Belarusian State Technological University

# AGRARIAN MOVEMENT IN BELARUS IN THE FUTURE SOLVING THE LAND ISSUE (MARCH – MAY 1917)

The article highlights the agrarian movement in the Belarusian provinces in the deployment phase of the revolutionary events that swept Russia in the spring of 1917, the Author notes that in March-April, forces of the newly elected state structures and socio-political structures of the peasants of Belarus is gradually acquainted with the change. At the demonstrations, rallies, prayers, processions were announced the tasks of the revolution-wide democratization, the war to the bitter end and the final decision of the agrarian question by the deputies of the Constituent Assembly. At the meetings, the peasants agreed to wait for land reform and provide maximum assistance to the army. Since the second half of April, peasant meetings with the newly elected volost committees began to make decisions on the transfer of state and private land, meadows, pastures to peasants, the expanding forest apiary. Activists of commissariats, food and land committees, judicial structures and «revolutionary democracy» – Councils of peasant deputies, public and party forces are involved in the termination of illegal decisions. In the spring of 1917, the agrarian movement in the Belarusian provinces did not acquire a mass character, the peasants did not openly Express their dissatisfaction with the state power.

**Key words:** revolution, the seizure of land, the agrarian question, the «revolutionary democracy».

**Уводзіны.** З першых тыдняў Лютаўскай рэвалюцыі дзяржаўныя структуры былі заклапочаны тым, каб звесткі аб падзенні самадзяржаўя не выклікалі захопу зямельнай уласнасці і, наогул, парушэнняў парадку ў вёсках. Сумеснымі з грамадскасцю намаганнямі ім удалося хутка і з найменшымі стратамі перапыніць лакальныя аграрныя правапарушэнні, выпадкі лясных высечак, захопаў чужой маёмасці і таму не ўяўлялі сур'ёзнай небяспекі для дзяржавы і новага ладу. У далейшым агітацыйна-прапагандысцкія мерапрыемствы былі скіраваны на перакананне сялянства ў абавязковым правядзенні аграрнай рэформы [1].

**Асноўная частка.** У звароце Часовага ўрада ад 19 сакавіка акрамя іншага даводзілася, што «зямельнае пытанне не можа быць праведзена ў жыццё шляхам якога-небудзь захопу і павінна быць вырашана шляхам закону, прынятага народным прадстаўніцтвам», гэта значыць Устаноўчым сходам. Да часу яго выбараў сялянства заклікалася да захавання парадку, падтрымкі ўрада і яго мясцовых органаў. Зямельная тэма гучала ў кантэксце больш важных задач – неабходнасці падпарадкавання новым уладам і выканання ранейшых абавязкаў.

Разам з выказанай падтрымкай Часоваму ўраду сяляне спадзяваліся на паляпшэнне

свайго становішча. Так, вяскоўцы рабілі адпаведныя звароты на адрас губернскіх камісараў з просьбай паўплываць на памешчыкаў, якія «непамерна ўзнялі цэны» на пасьбу сялянскай жывёлы [2].

Ваенныя ўлады былі ў ліку першых на Беларусі, хто прыклаў пэўныя намаганні ў тым накірунку. Імкнучыся палепшыць становішча з харчовым забеспячэннем армейцаў, 17 сакавіка Загадам галоўнакамандуючага штаба Заходняга фронту № 1491 сялянам дазвалялася арандаваць пустуючыя зямельныя участкі для яравых «...па 10–15 руб. за дзесяціну» [3].

Дэманструючы агульнадзяржаўны, пазакласавы характар сваіх планаў і рашэнняў, Часовы ўрад пастановай ад 11 красавіка «Аб ахове пасеваў» надаў харчовым камітэтам права перадачы ў арэнду сялянам незасеянай памешчыцкай і іншай зямлі. Гэтым самым адбылося пэўнае абмежаванне правоў памешчыкаў на свабоднае распараджэнне сваёй уласнасцю. Тым не менш гэта пастанова не магла задаволіць зямельнай патрэбы сялян, а наадварот, толькі ўзмацняла іх радыкальныя настроі.

Відавочна, што наступным крокам урадавай аграрнай палітыкі павінны былі быць ахова і рацыянальнае выкарыстанне ўсёй зямлі да часу маштабнай аграрнай рэформы.

Каб супакоіць сялян, 21 красавіка міністр земляробства Шынгароў А. заявіў аб заснаванні зямельных камітэтаў, якім належала рыхтавацца да рэформы, а праз пару дзён старшыня Часовага ўрада звярнуўся да насельніцтва «спакойна чакаць новага зямельнага ўладкавання».

Але да часу, пакуль змест пастановы аб зямельных камітэтах не зрабіўся здабыткам усяго грамадства і не ўвасобіўся на практыцы, на вёсцы павялічыліся выпадкі незаконнага выкарыстання сялянамі лясных угоддзяў. Іх з'яўленне абумовіла не толькі перабудова ўладных структур, у тым ліку рэпрэсіўнага апарату, а і пэўныя змены сялянскіх настрояў у адносінах да памешчыцкай, царкоўнай і нават дзяржаўнай маёмасці, асабліва лясных угоддзяў.

Частка землеўладальнікаў па-ранейшаму спадзявалася на сілу закона і не спрабавала перагледзець свае адносіны з дробнымі арандатарамі, сялянскімі таварыствамі, парабкамі. Непаразуменні нарасталі. «Минская газета» ад 6 красавіка 1917 г. паведамляла, што «з Заходняга краю паступаюць звесткі аб спешным продажы памешчыкамі сваіх маёнткаў па надта нізкіх цэнах. Спешнасць тлумачыцца чуткамі аб хуткай ліквідацыі памешчыцкіх зямель».

У некаторых сялянскіх грамадствах вызначыліся спробы самастойнага, без звароту за адпаведным дазволам у вышэйшыя інстанцыі, вырашэння наспелых праблем. Як гаварылася ў дакладной запісцы на адрас міністра ўнутраных спраў, «у красавіку з'явіліся першыя перамены ў сялянскай правасвядомасці ў адносінах да вырашэння зямельнага пытання і разам з гэтай пераменай сталі паступаць адпаведныя звесткі ў выглядзе тэлеграм з месцаў. Вёска, відавочна, стала адчуваць і ўспрымаць ідэі і праграмы, распрацаваныя і прынятыя ў гарадскіх цэнтрах» [4].

Мясцовыя камітэты спрабавалі скарыстаць рэвалюцыйныя перамены ў інтарэсах працоўнага сялянства. 16 красавіка Шацкі валасны камітэт Ігуменскага павета звярнуўся да Б. М. Самойленкі за садзеяннем у скарачэнні платы за пашу скаціны ў маёнтках Шацк, Юзефова, Веркалы і Антонава да 4 руб. [5].

Лунінецкі грамадскі камітэт запатрабаваў «выдачы з бліжэйшых лясоў – казённых і памешчыцкіх – матэрыялаў сельскім грамадам для пабудовы новай агарожы бясплатна», а таксама паляпшэння ўмоў утрымання сялянскай жывёлы. Акрамя таго, камітэт, прызнаючы прэрагатыву Устаноўчага сходу ў канчатковым вырашэнні зямельнага пытання, пакідаў за сялянскімі з'ездамі і грамадскімі камітэтамі правы на выкарыстанне бягучым летам зямельных угоддзяў [6].

Зразумела, што падобныя сялянскія пастановы былі незаконнымі і пагражалі нармальнаму пачатку пасяўных і іншых сельскагаспадарчых работ, ад чаго ў значнай ступені залежала і вырашэнне харчовай праблемы.

На Беларусі, як і паўсюдна па краіне, уласнікам лесу з'яўлялася дзяржава, памешчыкі, прадпрымальнікі, хутаране, сялянскія грамады і інш. З выпадку вайны значныя лясныя плошчы былі перададзены ў арэнду Усерасійскаму земскаму саюзу, ваенна-прамысловым камітэтам, ваенна-будаўнічым арганізацыям і г. д. У буйных памерах лясны матэрыял выкарыстоўвала армія для будаўніцтва ўмацаванняў, зямлянак, у якасці паліва. Лес з'яўляўся сыравінай для вырабу шпал, запалак, паперы і іншай прадукцыі.

Новаўвядзенні ў зямельных адносінах узмацнілі (у параўнанні з дарэвалюцыйным перыядам) незаконнае выкарыстанне (па сутнасці, крадзёж) сялянамі лесу ў выглядзе бярвенняў, жэрдак, дроў, прычым як для ўласных гаспадарчых патрэб, так і на продаж, а таксама пасьбу свойскай жывёлы ў лясных урочышчах.

Адным з матываў такіх паводзін сялян было перакананне ў наяўнасці ў іх поўных правоў на лясныя ўгоддзі, аб чым, у прыватнасці, адзначалася 19 красавіка на пасяджэнні Віцебскага губернскага камісарыята. Пры гэтым высечкі лесу адбываліся не адзінкавымі асобамі, а цэлымі грамадствамі і, што характэрна, па пастанове дзяржаўных органаў.

Як паведамляў 22 красавіка адзін з камісараў, «вельмі цяжка ўгаварыць сялян, каб не секлі прыватнаўласніцкіх лясоў, і высечка робіцца сістэматычна, згодна з пастановамі валасных харчовых камітэтаў». Так, з красавіка сяляне Пакоцкай воласці кожны дзень секлі лес у маёнтку Антонаўка, прычым, «не толькі для сваіх патрэб, але і на продаж» [7].

Пад канец красавіка Дзвінскі павятовы камісар па тэлеграфе паведаміў Віцебскаму камісару, што «арышты памешчыкаў адбываюцца на падставе спрэчак паміж імі і сялянамі. Адсутнасць хлеба і насення пагражае буйнымі ўскладненнямі. Настрой насельніцтва ў павеце нярвовы» [8].

Можна меркаваць, што харчовыя камітэты, якім даручалася распараджэнне ляснымі ўгоддзямі, мала лічыліся з павятовай або губернскай уладамі і дзейнічалі ў адпаведнасці з асабістымі інтарэсамі сваіх выбаршчыкаў, а не дзяржавы. Як паведамлялася ў газеце, «па пастанове Сушкоўскага харчовага камітэта Дрысенскага пав. сяляне самавольна сякуць лес» [9].

Такім чынам, і ў гэтым выпадку, нягледзячы на адпаведную пастанову, паводзіны сялян, на думку карэспандэнта, выглядалі незаконнымі. У такім сэнсе варта ўспрымаць паведамленне памочніка віленскага губернскага камісара Кліота, які ў пачатку мая паведамляў у сталіцу аб тым, што сяляне на падставе пастаноў валасных камітэтаў пасвілі жывёлу ў лясах.

Выпадкі выкарыстання сялянамі ўрадавых органаў у сваіх карыслівых мэтах узмацняліся пастановамі сялянскіх з'ездаў накшталт таго, які адбыўся ў Мінску 20–23 красавіка і прыняў рэзалюцыю «Па зямельным пытанні», дзе, у прыватнасці, адзначалася, што «ў межах дадзенай тэрыторыі ўсе зямельныя справы павінны вырашацца валаснымі камітэтамі». Пасля гэтага форуму ў Мінскім, Ігуменскім і Слуцкім паветах на адрас камісараў пайшлі скаргі памешчыкаў аб тым, што сяляне надаюць рэзалюцыям з'езду сілу закона і з дазволу валасных камітэтаў праводзяць пасьбу на прыватнаўласніцкіх выганах, здзяйсняюць высечкі лесу. У іх ліку называліся выпадкі, калі вяскоўцы пасвілі жывёлу ў лесе і на пашы маёнтка Прылукі.

Землеўласнік Мінскага і Ігуменскага паветаў Г. Э. Чапскі паскардзіўся Мінскаму губернскаму камісару аб тым, што «Самахвалавіцкі валасны камітэт пастанавіў выкарастаць усе пашы ў эканоміях сумесна з памешчыкам. У выніку чаго сяляне ў Падгаі пагналі скаціну 9 мая ў лес і на канюшыну ў маёнтку (маім) Прылукі. Гэтак ж у раёне Сеніцкай і Станькаўскай валасцей Мінскга павета і Дудзіцкай воласці Ігуменскага павета. Сяляне знішчаюць у лясах табліцы з паказаннем назвы, плошчы і ўласніка лесу, перашкаджаюць вывозіць з лесу нарыхтаваны лесапрамыслоўцамі і эканоміяй лясных матэрыялаў і дроў, замяняюць лясную варту.

Валасныя камітэты выносяць пастановы аб 8-гадзіным рабочым дні і аб норме заработнай платы не адпавядаючы магчымым умовам гаспадаркі (ад 3 руб. да 3 руб. 60 к. падзённай платы для жанчын і 360 руб. батраку). 8-гадзінны рабочы дзень месцамі ўводзіцца рабочымі гвалтам – фальварак Скарэнічы Сеніцкай воласці, Волчкавічы Самахвалавіцкай воласці, маёнтак Самуэдава Дудзіцкай воласці)» [10].

Больш складаная сітуацыя з парушэннямі была па Віцебскай губерні. Так, Віцебскі губернскі камісар Карташоў М. Л. аддаў загад аб спыненні беспарадкаў у фальварку Будаболь Петрапалаўскай воласці Полацкага павета, дзе «сяляне падзялялі зямлю і гоняць арандатара Макалінскага». Праз пару дзён, 25 красавіка ўладальнік маёнтка «Азёрка» Гарадоцкага павета Лільлё падаў скаргу губернскаму камісару на сялян, якія разбурылі яго маёнтак. Сяляне самавольна захапілі маёнтак Казлоўскага Рэжыцкага павета [11].

Падобныя факты траплялісся на Віленшчыне. Віленскаму павятоваму камісару паведамлялася, што сяляне Чапінскай воласці Віленскага павета самаўпраўна дзеляць зямлю ў маёнтку Пагарэлле.

У ліку першых паветаў Магілёўскай губерні аграрныя парушэнні сталі назірацца на Гомельшчыне, асабліва ў аддаленых ад павятовага цэнтра месцах. У іх ліку – самавольны захоп жыхарамі в. Ніжнія Дзятлавічы сенакосу плошчай 360 дзес. у арандаваным маёнтку. На хутары Чарнічча гэтыя ж сяляне сумесна з іншымі «самавольна і бясплатна» пасвілі скаціну. 226 дзес. хутара Нікольск Дзятлаўскай воласці, здадзеных у арэнду Міністэрству земляробства, былі «явачным парадкам захоплены» сялянамі вёсак Жыробнае і Бабовічы. На хутары Уза, – паведамляў работнік земства, – «сяляне забралі самавольна ўсё. Узаралі, убралі і скасілі». Такое ж становішча зафіксаваў перапісчык маёнтка Забельшына Клімавіцкага павета, у якім сяляне захапілі «па рэвалюцыйнаму праву» больш за 40 дзес. лугоў [12]. Але ў цэлым для Магілёўшчыны гэта не стала масавай з'явай. Невыпадкова 30 красавіка на губернскім сялянскім з'ездзе галоўная ўвага была нададзена харчовай праблеме і зямельным камітэтам.

У маі стаўленне сялян да памешчыцкіх лясных угоддзяў, як да сваёй уласнасці, якая мусіла перайсці да іх пасля Устаноўчага сходу разам з землямі, набыло непажаданы для ўлад размах, калі вяскоўцы сталі забараняць прамысловыя і камерцыйныя лесанарыхтоўкі. Так, 3 мая сяляне в. Крычкі Заслаўскай воласці

звярнуліся да мінскага камісара з просьбай забараніць уласнікам мясцовага фальварка прадаваць прамыславікам 14 дзес. лесу.

У пачатку чэрвеня ў маёнтку Язвіна Віцебскага павета лесапрамысловец Лерман Э. сіламі 150 рабочых вёў нарыхтоўку лесу для патрэб Рыга-Арлоўскай чыгункі. На агульным сходзе Лескавіцкага валаснога камітэта пад пагрозай арышту яго вымусілі даць падпіску аб спыненні далейшай высечкі [13]. У гэты ж час у Магілёўскі губернскі камісарыят звярнуліся лесапрамыслоўцы Аршанскага павета са скаргай на вяскоўцаў Нова-Тухінскай воласці, якія не дазвалялі ім праводзіць высечкі, маўляў, «зямля будзе наша і лес будзе наш». Прычым на сялянскім сходзе сумежных вёсак была вынесена пастанова аб выдачы на патрэбы тутэйшага жыхарства галля па цане 10 кап. за воз. У далейшым галлё прадавалася ў бліжэйшых гарадах і мястэчках, але ўжо па 10 руб. [14].

Неўзабаве сялянскі «мараторый» на лесанарыхтоўкі закрануў і інтарэсы дзяржавы. Невыпадкова ў зваротах Міністэрства земляробства і Петраградскага Савета да сялянства тлумачылася, што ва ўмовах вайны Расія не магла разлічваць на імпартны каменны вугаль, таму яго дэфіцыт неабходна было ўстараніць за кошт дрывянога паліва. Адозвы аб тым, што лесанарыхтовак «патрабавалі інтарэсы радзімы і інтарэсы абароны краіны» накіроўваліся і на Беларусь, дзе сяляне перапынялі «нарыхтоўку дроў і лясных матэрыялаў для патрэб насельніцтва і арміі». Так, валасныя камітэты Мазырскага павета не давалі секчы лес для вырабу шпалаў.

У ліку асоб, якія ініцыіравалі правапарушэнні, былі салдаты, асабліва дзэзерціры. Так, Віцебскі губернскі камісар адзначаў, што ў Дрысенскім павеце арганізатарамі парушэнняў з'яўляліся «прамоўцы з прышлых і адпускных салдат, якія распаўсюджвалі ленінскія погляды і дастаўлялі прадстаўнікам улады Часовага ўрада шмат клопатаў» [15].

Як вынікала з тэлеграмы Б. М. Самойленкі ад 12 мая ў Петраград, «аграрныя беспарадкі» ў губерні не мелі «абвостранага характару», а ў чэрвені яны істотна зменшыліся. Але падобная сітуацыя не магла быць нязменнай. Часам самі памешчыкі стваралі глебу для канфліктаў, бо не жадалі ісці на кампраміс нават у выкананні дзяржаўнай задачы па павелічэнні пасяўных плошчаў. «У нашай воласці застаецца каля 400 дзес. пустуючай зямлі памешчыкаў, – пісалі сяляне Таболкаўскай воласці на адрас Часовага ўрада і Петраградскага Савета, – якую мы ахвотна ўзаралі б, але ўладальнікі не робяць нам ніякіх уступак, ставяць нам высокія цэны на зямлю, наогул не жадаюць, каб мы аралі іх зямлю» [16].

Вядома, незаконныя пастановы валасных, у тым ліку харчовых камітэтаў, не заставаліся па-за ўвагай камісарыятаў. Большасць падобных пастаноў скасоўвалася або разглядалася ў судовых інстанцыях. Таксама з аграрнымі парушэннямі вялі барацьбу праз тлумачальна-асветніцкую работу савецкія структуры. Старшыні выканкама губернскага Савета сялянскіх дэпутатаў Міхайлаву М. В. (Фрунзе) давялося асабіста гутарыць з сялянамі Мінскага і Навагрудскага паветаў аб шкоднасці незаконных пастаноў. На думку М. В. Міхайлава (Фрунзе), прычынай узнікнення «лясных беспарадкаў» з'яўлялася «адсутнасць у многіх месцах зямельных камітэтаў і якіх бы то ні было судоў» [17].

**Заключэнне.** Такім чынам, фактычнае захаванне ў непарушнасці памешчыцкага землеўладання вычарпала ўладныя рэсурсы органаў Часовага ўрада, якія ўсімі сродкамі імкнуліся прадухіліць аграрны рух. Нават у тых умовах магчымасці рэалізацыі сялянамі сваіх эканамічных інтарэсаў толькі павялічваліся. Значную дапамогу ў гэтым адыгрывалі харчовыя і, асабліва, зямельныя камітэты. Паспрыяла таксама канфліктная ўстаноўка землеўласнікаў, якія не жадалі здаваць пустуючыя землі на льготных умовах вясковай грамадзе.

Разам з тым аграрны рух вясной 1917 г. не набыў масавага характару і значнай небяспекі для дзяржавы не ўяўляў. Сяляне засталіся прыхільнікамі вайны да пераможнага канца, працягвалі аказваць дапамогу арміі, удзельнічаць у хлебнай манаполіі і іншых урадавых ініцыятывах.

## Літаратура

1. Рыжанкоў І. М. Беларускае сялянства ва ўмовах падрыхтоўкі да аграрнай рэформы (сакавік – лістапад 1917 г.) // Весці Беларускага дзяржаўнага педагічнага універсітэта. Сер. 2, Гісторыя, філасофія, паліталогія, сацыялогія, эканоміка, культуралогія. 2006. № 1. С. 8–12.
2. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). Ф. 640. Воп. 2. Спр. 26. Л. 189.
3. Нацыянальны гістарычны архіў Рэспублікі Беларусь (НГАРБ). Інвентарны № 15301. Загады Галоўнакамандуючага Заходнім фронтам. № 2005.
4. Государственный архив Российской Федерации (ГАРФ). Ф. 1779. Оп. 1. Д. 297. Л. 2.
5. НАРБ. Ф. 640. Воп. 2. Спр. 26. Л. 189.
6. Рогожин Н. По деревням и сёлам // Земля и Воля. 1917. 3 мая. С. 3.
7. ГАРФ. Ф. 1779. Оп. 1. Д. 296. Л. 46.

8. НАРБ. Ф. 60. Воп. 3. Спр. 242. Л. 127.
9. Аграрное движение // Народное слово. 1917. 11 июня. С. 4.
10. НАРБ. Ф. 60. Воп. 3. Спр. 242. Л. 158–159.
11. НАРБ. Ф. 60. Воп. 3. Спр. 242. Л. 123.
12. НГАБ. Ф. 2084. Воп. 1. Спр. 677. Л. 6.
13. НАРБ. Ф. 60. Воп. 3. Спр. 242. Л. 139.
14. НАРБ. Ф. 60. Воп. 3. Спр. 242. Л. 225.
15. НАРБ. Ф. 60. Воп. 3. Спр. 242. Л. 171.
16. НАРБ. Ф. 60. Воп. 3. Спр. 154. Л. 8.
17. Разные известия // Народное слово. 1917. 24 июня. С. 4.

## References

1. Ryzhankou I. M. Belarusian peasantry in preparation for agrarian reform (March-November 1917) *Vesti Belaruskaga dzyarzhaunaga pedagagichnaga universiteta* [Vesti of the Belarusian state pedagogical University], series 2, History, Philosophy, Political Science, Sociology, Economics, Cultural Sudies, 2006, no. 1, pp. 8–12 (In Belarusian).
2. National Archives of the Republic of Belarus (NARB). Fund 60. I. 2. F. 26. P. 189.
3. National historic archive of Belarus (NHARB). Inventory number 15301. Orders of the chief commander of the Western front August 8, no. 2005.
4. State archive of the Russian Federation (SARF). Fund 1779. I. 1. F. 297. P. 2.
5. NARB. Fund 60. I. 2. F. 26. P. 189.
6. Rogozhin N. At the villages. *Zemlya i volya* [Land and Will], 1917, 3 May, p. 3 (In Russian).
7. SARF. Fund 1779. I. 1. F. 296. P. 46.
8. NARB. Fund 60. I. 3. F. 242. P. 127.
9. Agrarian movement. *Narodnoye slovo* [People's word], 1917, 11 June, p. 4 (In Russian).
10. NARB. Fund 60. I. 3. F. 242. P. 158–159.
11. NARB. Fund 60. I. 3. F. 242. P. 123.
12. NHARB. Fund 2084. I. 1. F. 677. P. 6.
13. NARB. Fund 60. I. 3. F. 242. P. 139.
14. NARB. Fund 60. I. 3. F. 242. P. 225.
15. NARB. Fund 60. I. 3. F. 242. P. 171.
16. NARB. Fund 60. I. 3. F. 154. P. 8.
17. Different news. *Narodnoye slovo* [Folk word], 1917, 24 June, p. 4 (In Russian).

## Інфармацыя пра аўтара

**Рыжанкоў Ігар Міхайлавіч** − кандыдат гістарычных навук, дацэнт, дацэнт кафедры гісторыі Беларусі і паліталогіі. Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт (220006, г. Мінск, вул. Свярдлова, 13а, Рэспубліка Беларусь). E-mail: im@belstu.by

## Information about the author

**Ryzhankou Ihar Mikhaylavich** – PhD (History), Associate Professor, Assistant Professor, the Department of History of Belarus and Political Science. Belarusian State Technological University (13a, Sverdlova str., 220006, Minsk, Republic of Belarus). E-mail: im@belstu.by

*Паступіў 23.03.2019*